***SUMMARY***
**Alena Filatova**
**Modern Belarusian Historiography of Confessional History of Rzecz Pospolita in XVII–XVIII centuries**
Until present, the history of confessions in Rzecz Pospolita in in XVII–XVIII centuries has not been a subject of thorough investigation in Belarusian historiography. No monograph has been published on the issue. The questions of confessional history were, in some or other way, was touched upon in a number of thesis, and only a few articles provide some initial information on the issue.
Key words: Rzecz Pospolita, Grand Duchy of Lithuanian, historiography, confessions.

***Алена Фірыновіч,***
***аспірантка Інстытут гісторыі НАН Беларусі***

# НАРМАТЫЎНАЯ БАЗА АДНОСІН УРАДУ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ ДА РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў 60-Я ГГ. XIX СТ.

Здійснено спробу систематизації в єдину нормативну базу інструктивно-розпорядчої документації царського уряду з регулювання діяльності Римо-Католицької Церкви на території Російської імперії під час і після закінчення повстання 1863-1864 рр.

Адносіны царскага ўраду да каталіцкай канфесіі на далучаных да Расійскай імперыі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыях складваліся даволі неадназначна. Мірнае суіснаванне абедзвюх інстанцый і лаяльнасць у дзяржаўным рэгуляванні дзейнасці каталіцкай царквы змяняліся ўзаемнай варожасцю і жорсткімі наступствамі з боку ўлады. У другой палове XIX ст. вектар адносін быў вызначаны падзеямі 1863-1864 гг. Патрыятычны настрой каталіцкіх святароў і вернікаў падштурхнулі царскую адміністрацыю наладзіць шэраг мерапрыемстваў па змяншэнню ўплыву каталіцкай веры на землях Расійскай імперыі. Ідэйным пастулатам такога накірунку палітыкі было меркаванне, што галоўнымі завадатарамі паўстання 1863-1864 гг., а таму і асноўнымі ворагамі расійскага ўраду, былі каталіцкае святарства і польская шляхта. У большасці рапартаў, паведамленняў, справаздач прадстаўнікоў усіх узроўняў кіруючых органаў дзяржаўнага апарату сустракаюцца сцвярджэнні тыпу: “Латинское духовенство всегда стремилось господствовать в Западном крае. Оно употребляло все усилия для истребления всего русского и православного, дабы через это поднять польское и католическое, представителями коего всегда были ксендзы” [12, с. 1].

З першымі адкрытымі праявамі нацыянальна-вызваленчага руху нарматыўная база рэгулявання жыццядзейнасці рымска-каталіцкай царквы стала змяняцца на больш жорсткую. Інтэнсіўная фаза гэтага працэсу ахоплівае перыяд з 1863 г. да

пачатку 70-х гг. XIX ст. Украінская гістарыяграфія вызначае яго як этап “встановлення цілковитої залежності Римо-католицької церкви від держави, витіснення цієї конфесії на периферію суспільного розвитку” [10, с. 93]. Толькі за 1864 г. на Правабярэжнай Украіне было прыпынена функцыянаванне ўсіх пазаштатных кляштараў, нерухомая маёмасць і капіталы касцёлаў былі поўнасцю перададзены ў распараджэнне казны. І гэта – асобныя прыклады абмежавання палітычнай, эканамічнай і рэлігійнай свабоды рымска-каталіцкай царквы [10, с. 100]. Такая сітуацыя была характэрна для ўсіх дзевяці заходніх губерняў Расійскай імперыі (Віленскай, Віцебскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай, Падольскай). Разгледзім яе больш падрабязна на прыкладзе Літоўскага генерал-губернатарства (Віленская, Гродзенская і Мінская губерні). Сярод распараджэнняў, напраўленых на паслабленне ролі каталіцкага элемента, патрэбна вылучыць наступныя:

– Цыркуляр камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі ад 4 лютага 1863 г. дазваляў рымска-каталіцкім святарам пакідаць свае прыходы толькі па вострай неабходнасці і пры наяўнасці відаў-дазволаў ад епархіяльнага начальства.

– Цыркуляр Галоўнага Начальніка Края ад 1 студзеня 1864 г. спыняў распаўсюджванне каталіцкай веры і польскай граматы праз забарону праваслаўным сялянам вучыцца па польскіх катэхізісах, мець польскія малітоўнікі і, увогуле, кнігі на польскай мове.

– Цыркуляры Віленскага генерал-губернатара ад 12 лютага 1864 г. і 15 сакавіка 1865 г. забаранялі ўжыванне польскай мовы ў афіцыяльнай перапісцы, што ў першую чаргу датычылася рымска-каталіцкага духавенства. Руская мова ўводзілася абавязкова ў літургічнае служэнне рыма-католікаў.

– “Высочайшее повеление”, выкладзенае ў цыркуляры Віленскага генерал-губернатара ад 24 чэрвеня 1864 г., забараняла будаваць новыя і аднаўляць старыя касцёлы, капліцы, алтары, без папярэдняй згоды генерал-губернатара, уводзіла парадак прызначэння ксяндзоў на прыхадскія пасады па згодзе генерал-губернатара, пасля разгляду кандыдатур на “благонадежность”.

– Цыркуляр Галоўнага Начальніка Края ад 28 ліпеня 1864 г. засноўваў сістэму грашовых спагнанняў з рымска-каталіцкага духавенства на выдаткі па ўтрыманню пад арыштам ксяндзоў за палітычныя правіны.

– Цыркуляр Галоўнага Начальніка Края ад 8 жніўня і з дапаўненнямі ад 19 верасня 1864 г. прадпісваў, што ўсталяванне крыжоў і святых выяў на палях, дарогах і па-за касцёламі магчыма толькі з дазволу грамадзянскага начальства [13, с. 60–80].

– Цыркуляр Галоўнага Начальніка Края ад 12 снежня 1864 г. абмяжоўваў прамаўленне пропаведзяў уласнага сачынення, апошняе дазвалялася тым святарам, якія мелі вучоную ступень, і толькі пасля атрымання ўхвалы цэнзара. У якасці канцэптуальнай асновы пропаведзяў прапаноўваліся надрукаваныя ў 1838 г. працы духоўнікаў Філіпецкага і Бялабржэўскага. Так, епіскапам Валанчэўскім на пасады цэнзараў у Мінскай губерні былі назначаны:

- у горадзе Мінску – асэсар кансісторыі прэлат Эдуард Петрашкевіч і рэктар семінарыі кананік Антоній Даманскі;
- у Мінскім павеце – кананік Юльян Календа ў м. Камень;
- у Ігуменскім павеце – дэкан Карл Гудвіловіч у м. Смілавічах і для Наднеменскага дэканата – дэкан Уладзіслаў Лекает у м. Аброці;

▪ у Барысаўскім павеце – выканаўца абавязкаў дэкана Франц Стражалка ў г. Барысаве;

▪ у Бабруйскім павеце – дэкан Сямён Макарэвіч у г. Бабруйску;

▪ у Мазырскім і Рэчыцкім павеце – законанастаўнік Мазырскай гімназіі Аляксандр Капцэговіч у г. Мазыры;

▪ у Пінскім павеце – законанастаўнік мясцовай гімназіі Франц Яшчолта ў г. Пінску;

▪ у Слуцкім павеце – дэкан Венедыкт Шымкевіч у г. Нясвіжы;

▪ у Навагрудскім павеце – дэканы: Іаан Пухальскі ў г. Навагрудку і Іосіф Шмігельскі ў м. Стваловічах [14, с. 149].

– Цыркуляр Галоўнага Начальніка Края ад 19 і 23 студзеня 1865 г. патрабаваў спецыяльны дазвол генерал-губернатара пры прызначэнні святароў на вышэйшыя духоўныя пасады і ў законанастаўнікі.

– Цыркуляр Галоўнага Начальніка Края ад 10 сакавіка 1865 г. спыняў дазвол працаваць праваслаўным у рымска-каталіцкіх кляштарах.

– Цыркуляр Віленскага генерал-губернатара ад 24 студзеня 1866 г. пастанавіў наладжваць працэсіі і крыжовыя шляхі толькі ў касцёле ці на тэрыторыі ўнутранага двору, па-за касцёлам усякія шэсці былі немагчымыя. Такія ж пастановы дублююцца ў распараджэннях ад 14 лютага 1866 г., 22 лютага 1867 г. і 14 мая 1868 г.

– Цыркуляр Віленскага генерал-губернатара ад 8 снежня 1866 г. патрабаваў спецыяльнага дазволу на адкрытае нашэнне святых дароў пры выкарыстанні запаленнага ліхтара і званкоў, на свабодны развоз па хатах аплатак перад Калядамі, на наведванне хворых і паміраючых для апошняга намашчэння ў бальніцах, дамах-прытулках.

– Цыркуляр Галоўнага Начальніка Края ад 13 студзеня і 27 чэрвеня 1867 г. забараняў пазаштатным ксяндзам адвольна адпраўляць багаслужэнне і выконваць хрысціянскія патрэбы.

– Цыркуляр Віленскага генерал-губернатара ад 11 красавіка 1867 г. спыняў адпраўленне саракагадзіннай літургіі падчас найгалоўнейшага каталіцкага свята – Вялікадня [13, с. 60–91].

– Цыркуляр Віленскага, Ковенскага, Гродзенскага і Мінскага генерал-губернатара ад 21 лютага 1869 г. прадпісваў паляпшэнне валодання рымска-каталіцкімі святарамі рускай мовы. Клерыкі, якія хацелі стаць законанастаўнікамі ў навучальных установах, павінны былі прайсці іспыты па рускай мове, айчыннай гісторыі і геаграфіі па праграме Міністэрства адукацыі для хатніх настаўнікаў.

– Цыркуляр Віленскага, Ковенскага, Гродзенскага і Мінскага генерал-губернатара № 26 ад 13 сакавіка 1869 г. перадаў навучанне небагаслоўскіх прадметаў у рымска-каталіцкіх семінарыях свецкім настаўнікам мясцовых гімназій ці павятовых вучылішч, а навучэнцам рымска-каталіцкага веравызнання Закон Божы павінен быў выкладацца на рускай мове [13, с. 49–50].

Гэта далёка няпоўны спіс распараджэнняў у сістэме ўрадавага кантролю каталіцкай царквы ў час і пасля заканчэння паўстання 1863-1864 гг. У дадзены перыяд таксама было ўведзена шмат адзінаразовых пастаноў, выкананне якіх знімала іх далейшую патрэбу. Часцей за ўсё яны датычыліся аштрафавання, пошуку, абмежаванняў пэўных дзеянняў для асобных святароў, кляштараў, брацтваў. Напрыклад, у распараджэнні камандуючага войскамі Магілёўскай губерні ад 4 лютага

1863 г. змяшчалася наступнае: “Викарный Черневецкого костела, Ямпольского уезда Подольской губернии, ксендз Ковальский, распространявший между крестьянами предосудительные толки, о чем еще не окончено производящее следствие, в ночь на 31 прошлого июля неизвестно куда скрылся [...] предписываю Вам [...] его немедленно арестовать” [13, с. 387]. Праз месяц ксёндз быў арыштаваны, таму сіла дзеяння такога прадпісання знікла аўтаматычна. Шэраг загадаў агульнага характару, якія датычыліся ўсіх слаёў насельніцтва, не абміналі і каталіцкае духавенства. Зразумела, што цыркуляр Віленскага генерал-губернатара, складзены 31 мая 1863 г., аб забароне спеваў патрыятычных песен, нашэння жалобы, эмблематычных сімвалаў польскай нацыянальнасці, датычыўся і каталіцкага кліра. Вышэй пералічаныя заканадаўчыя акты склалі аснову сістэмы карных мерапрыемстваў царызму супраць каталіцкай царквы.

Адным са спосабаў пакарання каталіцкага духавенства за парушэнне ўстаноўленых цыркулярамі норм і правіл былі штрафы, памер якіх вызначаўся 25 рублямі серабром. Але гэтай грашовай мяжы не заўсёды прытрымліваліся службовыя асобы царскай адміністрацыі, прычым павышэнне ці паніжэнне сумы штрафа ніколі не абгрунтоўвалася. Так, на святара Котзіка Зэльвенскага касцёла Гродзенскай губерні быў накладзены штраф 200 рублёў за ўжыванне польскай мовы ў афіцыйнай перапісцы [7, с. 6]. Святары загадзя ішлі на хітрыкі, ведаючы магчымасць накладання штрафу за палітычна неблаганадзейныя ўчынкі. Напрыклад, у рапарце Палітычнага аддзела № 21 паведамляецца: “...какой-то ксендз [...] за выдачу метрики на польском языке (без русского перевода) был оштрафован 10 руб. сер.; вследствие чего, при выдаче второй раз метрики, он взял с крестьянина 20 р. за таковую, прибавив, что это делается на случай штрафа, который могут взыскать с него” [8, с. 1]. Іншымі мерамі пакарання былі пазбаўленне духоўнага сану, зняволенне ў кляштары пад нагляд, арышт, высылка ва ўнутраныя губерні Расійскай імперыі і г. д. У выпадках, калі прадстаўнікоў каталіцкага кліра за правіны палітычнага характару адносілі да другой (непасрэдны ўдзел – член паўстанцкага атраду) ці чацвёртай (садзеянне паўстанню правіянтам, грашыма, сродкамі руху і г. д.) катэгорыі злачынцыў, то іх па законнаму праву перадавалі ваенна-палявому суду, пазбаўлялі сану, канфіскоўвалі прыналежныя ім спадчынныя землі, арыштоўвалі і высылалі ў Сібір на тэрмін ад аднаго да пяці гадоў. Дастаткова распаўсюджаным было зняволенне ў кляштары, што з’яўлялася вельмі зручнай і выгаднай для ўрада мерай, якая на законнай аснове ізалявала каталіцкае духавенства ад насельніцтва. Для гэтага Міністэрства ўнутраных спраў выдала спецыяльную інструкцыю ад 9 красавіка 1864 г. Яна ўключала 18 палажэнняў. Пакараныя ксяндзы перадаваліся пад нагляд манастырскага начальства і мясцовай паліцыі, не дапускаліся да выканання абрадаў і публічных богаслужэнняў, не маглі пакідаць тэрыторыю кляштара нават па самай вострай неабходнасці, мелі магчымасць спаткання з чужымі асобамі толькі з дазволу епархіяльнага начальства, уся іх карэспандэнцыя строга кантралявалася плябанам. На ўтрыманне пакараных выдавалася па 50 капеек у суткі на чалавека. Зняволеныя накіроўваліся як у мясцовыя кляштары, так і ва ўнутраныя губерніі Расійскай імперыі, тэрмінам ад 12 месяцаў да 3 гадоў. Каталіцкіх святароў перавозілі чыгункай (вагонамі трэцяга класу) ці конным падводам, асобна ад свецкіх арыштантаў, у суправаджэнні канвою, які складаўся

з аднаго або двух прадстаўнікоў ніжэйшага чыну жандарскай акругі. Пасля заканчэння прызначанага тэрміну прадстаўнікі духоўнага сану вызваляліся на аснове дазволу Міністэрства ўнутраных спраў, з пасведчаннем епархіяльнага начальства аб іх станоўчых паводзінах [13, с. 87]. Такая падрабязнасць у арганізацыі карнага мерапрыемства пацвярджае яго важнасць у рэлігійнай палітыцы царскага ўрада 60-х гг. XIX ст.

Калі на пачатку дзесяцціголдзя каталіцкіх святароў прыцягвалі да адказнасці толькі за сапраўды антыўрадавыя ўчынкі (спеў нацыянальных гімнаў, удзел у дэманстрацыях, яўнае выказванне супраць царызму і г. д.), то з 1864 г., скарыстаўшыся сваімі паўнамоцтвамі, прадстаўнікі кіруючых органаў каралі проста за двухсэнсоўныя выказванні і падазроныя дзеянні (зразумела на іх думку). Так, ксёндз і арганіст Семяціцкага касцёла Бельскага павета былі арыштаваны на адзін месяц, таму што земскаму спраўніку падалося, быццам у час літургіі рэлігійная песня “Сардэчная Маці” выконвалася на матыў патрыятычнага гімна “З дымам пажараў” [3, с. 1].

Распараджальна-інструкцыйныя база рэпрэсіўных мер першапачаткова закранала толькі каталіцкі клір, пазней увага была пераведзена і на прадстаўнікоў іншых сацыяльных слаёў. Першыя абмежаванні датычыліся шлюбаў паміж каталікамі і праваслаўнымі, якія нават пасля паўстання 1830–1831 гг. лічыліся прымальным спосабам асіміляцыі першых другімі. Аднак, у сувязі з паўстаннем 1863-1864 гг. адбываецца пераход ад палітыкі ўхвалення змешаных шлюбаў да заахвочвання монаканфесійных. Так, Міністр унутраных спраў ад 14 жніўня 1864 г. № 8827 загадваў, што “служащие чиновники не могут иначе вступать в брак, как с разрешения Начальника”, і прапаноўваў “правило это соблюдать в точности и стараться, чтобы русские чиновники преимущественно женились на православных; для чего можно будет давать им отпуски” [4, с. 3]. Пасля гэтага распараджэння было пададзена шмат прашэнняў на дазвол шлюбу паміж асобамі каталіцкага і праваслаўнага веравызнання, аднак улады часта адмаўлялі, абгрунтоўваючы тым, што жонкі-каталічкі “ополячивают своих мужей так, что он забывает свой родной язык, говорит по-польски, русское общество совершенно оставляет [...], а дети то их самые жалкие создания, они ни русские, ни поляки, потому что крестятся только по-русски, а после этого мать как полька то и ведет их совершенно на свой лад, они не бывают в русской церкви и не знают обрядов православной церкви, не умеют даже креститься и молиться по-русски” [9, с. 2]. Другім варыянтам рашэння аб змешаным шлюбе быў дазвол, але толькі па праваслаўнаму абраду. Згодна загаду генерал-губернатара ад 5 кастрычніка 1864 г., калі “одна из сторон вступающего в брак веры православной, то и венец должен быть произведен священником православным” [2, с. 2]. Відавочна, кіраўніцтва Расійскай імперыі было ахоплена страхам перад сілай і трываласцю каталіцызма сярод насельніцтва “Паўночна-Заходняга краю”. Таму рэпрэсіўным дзеянням падвяргаліся не толькі святары і вернікі, але і культава-літургічны абрад, адукацыйна-выхаваўчая сістэма і моўная культура.

Адкрытыя інтэнсіўныя замахі на каталіцкае веравызнанне патрабавалі альтэрнатыўнай яму замены, бо адной з галоўных тагачасных каштоўнасцей народа была вера. Зразумела, урад звярнуўся да “истинной веры русского народа” –

праваслаўя. Распаўсюджванне і ўзвышэнне праваслаўя адбывалася штучнымі, у большай ступені колькаснымі метадамі. На першае месца сярод такіх спосабаў выступала ўзвядзенне новых цэркваў. Аб маштабнасці і прыярытэтнасці гэтага накірунку гавораць правілы для пабудовы праваслаўных цэркваў, прынятыя 23 мая 1865 г. Абгрунтаванне неабходнасці вызначанага мерапрыемства праводзілася ў прэамбуле: “Так как Православные храмы Божие должны служить вековыми свидетелями великой эпохи возрождения православия и русской народности в Северо-Западном крае, искони русском, страдавшем так долго под гнетом Латино-польской пропаганды, – а потому постройка таковых должна быть проведена с изящностью, капитально и без излишней поспешности” [6, с. 2]. Месца для будаўніцтва выбіралася ў цэнтры вёскі ці сяла “на самом видном и лучшем месте, как и подобает русской святыни”. Храмы павінны былі будавацца з каменню і цэглы, калі ж у мясцовасці ўзнікалі перашкоды для іх дастаўкі, то з мэтай эканоміі цэглу выкарыстоўвалі выключна для ўнутранага абшывання і асновы для вакон і дзвярэй. Купалы гарадскіх цэркваў дазвалялася рабіць толькі каменныя або жалезныя, у малых вёсках – драўлянныя. Лес нарыхтоўваўся восенню і вывозіўся зімнім шляхам. Для будаўніцтва запрашаліся майстры з унутраных губерняў Расійскай імперыі, для якіх прадугледжваліся матэрыяльныя заахвочванні. Меркавалася, што “…пребывание подобных артелий среди православного населения здешнего края неминуемо поселит прочные семена чисто русской жизни и ознакомит здешний народ с остальной Россией” [6, с. 5]. Тэрмін узвядзення храма ахопліваў ад аднаго да пяці гадоў. Калі ў мясцовасці ўвогуле не было нават малітоўнага дому, то на будоўлю адводзілася ад аднаго да двух гадоў. Там, дзе цэрквы мелі трухлявы стан, іх аднаўленне павінна было здзяйсняцца не больш як за год. У мясцовасцях з наяўнасцю старых будынкаў усталяванне новых адтэрміноўвалі на тры, чатыры і пяць гадоў. Звярталася ўвага і на памяшканні для праваслаўных святароў, якія павінны былі ўзводзіцца недалёка ад цэркваў, абсажвацца дрэвамі і мець прыгожы, утульны выгляд. Фінансаванне праектаў ажыццяўлялася за кошт працэнтных збораў з памешчыцкіх маёнткаў. Зямельныя пытанні прадпісвалася вырашаць з памешчыкамі (у прыватных уладаннях) і з Палатай дзяржаўнай маёмасці (у казённых). Да важнай справы прыцягваліся ўсе слаі насельніцтва, асабліва сялянства, якое магло “уделять посильную лепту в воспоминание своего освобождения и в благодарность за щедрые милости, излитые на крестьянское население нашим Великим Государем”. Для кантролю над будаўніцтвам былі арганізаваны спецыяльныя царкоўныя камітэты і саветы [6, с. 6].

Узвышэнне праваслаўя адбывалася таксама праз зварот у яго прадстаўнікоў іншых веравызнанняў, што вызначалася спецыяльнай інструкцыяй. Каталікі пераводзіліся вельмі лёгка, бо “Римско-католическое вероисповедание так близко к Православному, что переходу из первого в последнее не положено никаких стеснений” [5, с. 16]. Праваслаўныя святары мелі права вольнага (без папярэдняй падрыхтоўкі) пераводу вернікаў, патрабуючы толькі падпіску аб пацвярджэнні жадання прыняць праваслаўе. У канцы кожнага месяца яны падавалі ўраду звесткі аб колькасці перайшоўшых. Ваенныя начальнікі павінны былі браць жадаючых прыняць праваслаўе пад сваю апеку і агароджваць ад усякіх

спробаў адмовіць іх ад гэтага кроку. Гэта датычылася і зняволенных, але да іх яшчэ раз на тыдзень пасылалі праваслаўнага святара, каб пацвердзіць сапраўднасць жадання прыняцця праваслаўя. Працэдура пераводу прадстаўнікоў мусульманскай і іудзейскай веры была больш складаная. Спачатку патрабавалася падпіска, пасля прысяга на вернасць праваслаўю, і калі яны былі гатовыя да споведзі і прычасця, то адразу да іх дапускаліся. Новаправаслаўных запісвалі ў метрычныя кнігі, ім прадпісвалася хадзіць на ўсе святы ў царкву, раз на год спавядацца і прычашчацца, абавязкова прыводзіць у царкву дзяцей з 7 гадоў. За адступленне ад праваслаўя строга судзілі. Агітаваць за зварот інаверцаў у сваю веру маглі толькі праваслаўныя святары [5, с. 210]. Разумеючы сэнс рэлігійнай сітуацыі ў краі, просты народ спекуляваў пераходам у праваслаўе. Ёсць звесткі, што за прыняцце праваслаўя зняволенныя патрабавалі свабоды і г. д. [1, с. 22] Такія правілы і інструктыўныя прадпісанні яскрава адлюстроўваюць дзяржаўную палітыку ў дачыненні да каталіцкай канфесіі на беларуска-літоўскіх землях у другой палове XIX ст.

У час ваеннага становішча ў Расійскай імперыі жорсткаму пераследу падвяргаліся прадстаўнікі ўсіх слаёў насельніцтва, падазраваныя ва антыўрадавай дзейнасці. Але каталіцкаму духавенству прыходзілася цярпець асаблівыя праявы гэтага працэсу, што было выклікана недаверам да каталіцкай царквы, які існаваў у вярхах расійскага ўраду яшчэ з 30-х гг. XIX ст. З 1863 г. ён значна ўзмацніўся. Галоўная дзеючая сіла паўстання – мясцовая шляхта і дваране – у абсалютнай большасці былі каталікамі. Таму і склалася такая сістэма рэпрэсіўных мер у адносінах да самай уплывовай канфесіі беларуска-літоўскіх зямель. Для высокай выніковасці карнай палітыкі патрэбна была прадуманая нарматыўная база, якая б давала законныя асновы для эфектыўнага яе ажыццяўлення. Сістэматызацыя вылучаных цыркуляраў і пастаноў дазволіла вызначыць падставы ўзнікнення тых ці іншых распараджальных мерапрыемстваў і вылучыць іх групы: а) нормы і правілы для каталіцкага кліра, б) нормы і правілы для вернікаў, в) нормы і правілы для культава-літургічнага абраду рымска-каталіцкай царквы. У сукупнасці яны і стварылі даволі дзейсную нарматыўную базу канфесійнай палітыкі Расійскай імперыі ў 60-я гг. XIX ст.

1. Дело о брошенном камне в часового из окна камеры политзаключенных в здании быв. Побернардинского монастыря г. Минска. Прошение лиц, содержащихся в тюрьме по обвинению за участие в восстании, о переводе их из римско-католической веры в православную и освобождении из-под ареста // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей – НГАБМ). – Ф. 296. – Воп. 1. – Спр. 75.
2. Дело о взыскании штрафа с ксендза Шерешевского костела Осмольского за обвенчание Унтер-офицера Стаховского православного исповедания // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна (далей – НГАБГ). – Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 625.
3. Дело о заключении в тюрьму органиста Семятицкого Костела Озинкевича за исполнение запрещенного гимна в костеле // НГАБГ. – Ф. 1. – Воп. 22. – Спр. 1136.
4. Дело о запрещении русским чиновникам жениться на польках // НГАБГ. – Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 417.
5. Дело о переходе разных лиц из римско-католического вероисповедания в православное // НГАБГ. – Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 380.

6. Дело о постройке православных церквей в Северо-Западном крае и об обеспечении сельского православного духовенства землей и строениями // НГАБМ. – Ф. 2001. – Воп. 1. – Спр. 986.
7. Дело о привлечении к ответственности ксендза Котзика за агитацию крестьян к переходу в католическую веру // НГАБГ. – Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 495.
8. Дело по обвинению ксендза Полонечского костела Новогрудского уезда в выдаче крестьянам метрик на польском языке и взымание за это денег // НГАБМ. – Ф. 296. – Воп. 1. – Спр. 157.
9. Дело по предписанию командующего войсками Виленского военного округа об офицерах Витебского батальона внутренней стражи, женящихся на польках // НГАБМ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31449.
10. Історія релігії в Україні: У 10 т. / Редкол.: А. Колодний (голова) та ін. – Київ, 2001. – Т. 4: Католицизм // За ред. П. Яроцького. – 598 с.
11. Переписка с приставом Могилевской губернии, командующими войсками по Могилевской губернии, о лицах участвовавших в восстании Могилевской губернии // НГАБМ. – Ф. 3255. – Воп. 1. – Спр. 1.
12. Переписка с Сокольским военным начальником и Сокольским уездным исправником о количестве существовавших братств при римско-католических костелах по Сокольскому уезду // НГАБГ. – Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 795.
13. Циркуляры Виленского, Ковенского, Гродненского и Минского генерал-губернатора о запрещении некоторых религиозных обрядов римско-католическому духовенству // НГАБМ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 1671.
14. Циркуляры и предписания минских военного и гражданского губернаторов пинскому уездному военному начальнику об аресте участников восстания лиц, причастных к нему, запрещению в официальной переписке польского языка, закрытии польских библиотек и принятии других мер по подавлению восстания // НГАБМ. – Ф. 1521. – Воп. 1. – Спр. 6.

***SUMMARY***

**Alena Firynovich**

**Normative base of Russian empire government relations to the roman catholic church in the 60$^{th}$ 19 c.**

In the article an effort was made to systemize instructive order documents of royal administration in the regulation sphere of roman catholic church on Russian empire territory during and after the revolt of 1863-1864 into an integrated normative base.